УЗГОДНЕНА
Намеснік Міністра культуры
Рэспублікі Беларусь
В.М.Чэрнік 30.08.2013 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Дырэктар Рэспубліканскага
цэнтра нацыянальных культур
М.Л.Рыбакоў 30.08.2013 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Старшыня Беларускага таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма"
М.У.Дубянок 30.08.2013 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб конкурсе сярод грамадскіх арганізацый беларускіх суайчыннікаў за мяжой на лепшыя дасягненні ў арганізацыі і рэалізацыі праектаў па папулярызацыі беларускай культуры ў краінах пражывання беларускай дыяспары
## (конкурс “КУЛЬТУРА”)

**Асноўныя мэты і задачы конкурсу:**

прыцягненне грамадскіх арганізацый і асобных беларускіх суайчыннікаў за мяжой да папулярызацыі і прасоўвання культурнай спадчыны беларускага народа і сучасных дасягненняў Рэспублікі Беларусь у галіне культуры ў краінах іх пражывання;

падтрымка праектаў “народнай дыпламатыі” ва ўмацаванні добрага іміджу Беларусі і беларускага народа ў свеце;

падтрымка і заахвочванне арганізацый беларускіх суайчыннікаў за мяжой у ажыццяўленні імі культурна-асветніцкай дзейнасці па захаванню і папулярызацыі беларускай культурнай спадчыны ў свеце;

садзейнічанне актывізацыі наладжвання канструктыўных кантактаў узаемакарыснага супрацоўніцтва зацікаўленых у Беларусі з беларускімі суайчыннікамі за мяжой па развіццю і рэалізацыі праектаў па папулярызацыі культурнай спадчыны беларускага народа;

падтрымка і папулярызацыя мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё і ўмацаванне кантактаў Рэспублікі Беларусь з беларускімі суайчыннікамі за мяжой у галіне культуры.

**Заснавальнікі конкурсу:**

Дзяржаўная ўстанова "Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур" і Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой "Радзіма" пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

У якасці сузаснавальнікаў могуць выступаць дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, фізічныя і юрыдычныя асобы, якія засноўваюць свае заахвочвальныя прызы ўдзельнікам конкурса ці іншым чынам спрыяюць рэалізацыі данага праекта.

**Удзельнікі конкурсу:**

да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца грамадскія арганізацыі і асобныя беларускія суайчыннікі, што пражываюць за мяжой, дзяржаўныя органы і іншыя зацікаўленыя ў Рэспубліцы Беларусь, якія здзяйсняюць, сумесна з беларускімі суайчыннікамі замежжа, праекты па папулярызацыі і прасоўванню традыцый беларускай культуры за мяжой.

**Агульныя палажэнні:**

1. ***Тэрміны:***

1.1. Конкурсны перыяд - каляндарны год.

1.2. Заяўкі і матэрыялы на ўдзел у конкурсе накіроўваюцца ў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур да 1 лютага года, наступнага за мінулым каляндарным годам. Форма

заяўкі – адвольная, але з дакладнымі рэквізітамі і кантактамі ўдзельніка. Час адпраўкі вызначаецца па паштоваму штэмпелю.

1.3. Апрацоўка прадстаўленых удзельнікамі фактычных матэрыялаў аб здзяйсненні імі значных культурных праектаў і іншай паслядоўнай культурнай дзейнасці за мяжой (у конкурсным каляндарным годзе) і падвядзенне вынікаў здзяйсняецца на працягу месяца з моманту спынення прыняцця заявак.

1.4. Інфармацыя аб ўдзельніках конкурса змяшчаецца арганізатарамі на сайце Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур http://centrkult.iatp.by, газеце для суайчыннікаў за мяжой "Голас Радзімы" і ў СМІ Беларусі пасля афіцыйнага падвядзенні вынікаў конкурса. Конкурсныя матэрыялы могуць прадастаўляцца СМІ Беларусі і выкарыстоўвацца як метадычны матэрыял (з захаваннем спасылак на аўтараў) з моманта іх атрымання арганізатарамі конкурса.

2. ***Умовы адбору:***

2.1. Спіс удзельнікаў фарміруецца з ліку падаўшых пісьмовую заяўку на ўдел у конкурсе ў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. Да заяўкі прыкладваецца агульная апавядальная інфармацыя пра фактычна здзейсненную працу, яе значнасць і выніковасць, і дадаткі, якія дакументальна гэта пацвярджаюць.

2.2. Матэрыялы конкурса павінны даступна распавядаць пра беларускую культурніцкую дзейнасць удзельнікаў, мець адпаведную эстэтычную апрацоўку ў выглядзе альбома ці ў іншай форме аздабляльнай форме - па задумцы ўдзельніка. Падцвяржальнымі матэрыяламі з'яўляюцца: аўдыё, фота і відэа на дысках; ксеракопіі публікацый у СМІ з рэквізітамі выхаду і асабістыя СМІ; граматы і падзячныя лісты; пагадненні аб супрацоўніцтве; метадычныя напрацоўкі; іншае.

2.3. Адбор і фарміраванне спісу лаўрэатаў конкурса ажыццяўляецца па кожнай асобна ўзятай краіне знаходжання беларускіх суайчыннікаў і рэгіёнаў Беларусі, якія прымаюць удзел у конкурсе, на падставе лепшых і цікавейшых узораў, пададзеных на конкурс матэрыялаў.

2.4. Жаданыя крытэрыі выніковасці дзейнасці – умацаванне станоўчага аўтарытэту грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа; добрыя водгукі мясцовага насельніцтва і пашырэнне ведаў пра Беларусь і беларускую культуру ў месцах пражывання суайчыннікаў; развіццё культурных і іншых стасункаў на карысць умацавання беларускасці у свеце.

3. ***Прызавы фонд і ўзнагароджанне:***

3.1. Набыццё заахвочвальных прызоў забяспечваецца Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур пры падтрымцы і па ўзгадненню з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і размяркоўваецца паміж лепшымі ўдзельнікамі конкурса.

3.2. Дадатковы прызавы фонд можа фарміравацца таксама за кошт сродкаў сузаснавальнікаў і мецэнатаў конкурса, якія пажадалі прыняць удзел у яго правядзенні.

3.3. Уручэнне прызоў лепшым удзельнікам конкурса здзяйсняецца яго заснавальнікамі, прадстаўнікамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і замежных устаноў Рэспублікі Беларусь у краінах знаходжання беларускіх суайчыннікаў.

***4. Кантакты арганізатараў:***

Дзяржаўная ўстанова "Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур".
220029, г.Мінск, вул. Чычэрына, 19 - 105. E-meil: RCNK-1994@mail.ru.
тэл. + 375 (17) 290-04-07, 290-04-08, 237-86-04.

"Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой "Радзіма".
г. Мінск, вул. Захарава, 23. E-meil: radzimabelarus@mail.ru. +375 (17) 288-12-01.